■ Спорт-тайм

# СУСВЕТНАЯ ГРУПА ЎСЁ БЛІЖЭЙ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра чарговыя перамогі айчынных тэнісістаў, «бронзавы» поспех валейбалістак і пра вынікі другога тура чэмпіянату краіны па футболе.**

***1. Каманда Прэзідэнта Беларусі восьмы раз перамагла ў Рэспубліканскіх спаборніцтвах па хакеі з шайбай сярод аматараў на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.*** У другім фінальным матчы турніру, які праводзіцца дзясяты раз, хакейная дружына кіраўніка дзяржавы на лядовай пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» абыграла каманду Мінскай вобласці з лікам 9:4.

***2. Беларускія тэнісісты працягнуць барацьбу за выхад у сусветную групу Кубка Дэвіса.*** У матчы другога раўнда І групы Еўра-Афрыканскай зоны супраць аўстрыйцаў, які прайшоў на выхадных, яны атрымалі перамогу з лікам 3:1. Нагадаем, у стартавым паядынку 7 красавіка Ягор Герасімаў быў мацнейшым за Геральда Мельцэра (6:3, 6:3, 6:3), а пазней Ілья Івашка перайграў Юргена Мельцэра — 7:6, 3:6, 6:3, 6:1. У суботу беларускі дуэт Максім Мірны/Яраслаў Шыла саступіў аўстрыйскай пары Юліян Ноўл/Юрген Мельцэр (4:6, 6:7, 7:6, 4:6). Трэцяе ачко заваяваў Ілья Івашка, перайграўшы Геральда Мельцэра — 7:6, 3:6, 6:3, 6:1.

— *Гэтая каманда не ведае кансервацыі — яна ўвесь час развіваецца і расце. Мы з Максам 4 гады спрабавалі ўварвацца ў Сусветную групу, а хлопцы робяць усё нашмат хутчэй,* — адзначыў **капітан беларускай каманды Уладзімір ВАЛЧКОЎ.** — *Разам з добрым вынікам відавочны вельмі вялікі патэнцыял каманды. Па-першае, і Ілья, і Ягор, і Яраслаў маюць выдатныя магчымасці для развіцця. А Максіму Мікалаевічу і зусім расці няма куды, яму галоўнае як мага даўжэй застацца на тым жа ўзроўні.*

Пяты матч згуляны не быў. Згодна з правіламі, калі адна з камандаў перамагае з лікам 3:1 і пры гэтым чацвёрты матч чатырохсэтавы, фінальная адзіночная сустрэча не праводзіцца.

У плэй-оф за выхад у Сусветную групу акрамя зборнай Беларусі згуляюць тэнісісты Аўстраліі, Бельгіі, Францыі і Сербіі.

***3. Беларускія валейбалісткі заваявалі бронзавыя ўзнагароды чэмпіянату Еўропы (U-18), які завяршыўся ў галандскім Арнэме.*** У матчы за трэцяе месца нашы дзяўчаты перамаглі каманду Сербіі — 3:2. Адзначым, што беларускія валейбалісткі заваявалі ўзнагароды еўрапейскага першынства для гульцоў да 18 гадоў упершыню з 2001 года.

***4. У Брэсце завяршыўся фінал чатырох SEHA-лігі, перамогу ў турніры святкавалі гандбалісты македонскага «Вардара».*** У фінальным паядынку яны перайгралі «Веспрэм» з лікам 26:21. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова заваяваў бронзавыя ўзнагароды, абыграўшы харвацкі «Заграб» — 23:19.



Тым часам мінскі СКА стаў бронзавым прызёрам Балтыйскай лігі. У Эстонскай Пыльве, дзе прайшла завяршальная стадыя турніру, падапечныя Ігара Папругі ў сустрэчы за выхад у фінал саступілі фінскаму «Рыіхімякі». А ў матчы за «бронзу» абыгралі мясцовую «Пыльву» 26:23. Залатыя ўзнагароды заваявалі гандбалісты «Рыіхімякі», у складзе якога, адзначым, гэтак жа ёсць беларусы — Аляксандр Цітоў і Аляксандр Бачко.

Нагадаем, у мінулым годзе мінскія «армейцы» былі сярэбранымі прызёрамі Балтыйскай лігі.

***5. На выхадных прайшоў другі круг чэмпіянату краіны па футболе.*** Дзеючыя пераможцы футбалісты барысаўскага БАТЭ дабіліся першай перамогі ў новым першынстве, абыграўшы «Мінск» з лікам 1:0. «Гомель», які вярнуўся ў вышэйшую лігу, згуляў у нічыю з «Шахцёрам» — 0:0. Нічыя была зафіксавана таксама і ў матчы «Крумкачоў» з брэсцкім «Дынама» — 1:1. Футбалісты мінскага «Дынама» атрымалі перамогу над навапалацкім «Нафтанам» — 1:0. Магілёўскі «Дняпро» перайграў футбалістаў «Віцебска» — 4:0. Дзве сустрэчы завяршыліся з аднолькавым вынікам 1:0 — гродзенскі «Нёман» адолеў у гасцях «Іслач», а мазырская «Славія» ў сябе дома ўзяла верх над «Гарадзеяй». У панядзелак другі тур 27-га чэмпіянату Беларусі ў вышэйшай лізе завяршыўся матчам «Слуцк» — «Тарпеда-БелАЗ».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.18 | 20.04 | 13.46 |
| Віцебск — | 6.05 | 19.56 | 13.51 |
| Магілёў — | 6.08 | 19.54 | 13.46 |
| Гомель — | 6.08 | 19.48 | 13.40 |
| Гродна — | 6.34 | 20.19 | 13.45 |
| Брэст — | 6.37 | 21.16 | 14.39 |

## Месяц

*Поўня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

**Пр.** *Астапа, Івана, Кірылы, Марка.*
**К.** *Ізольды, Лявона, Станіслава, Філіпа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**11 КРАСАВІКА**

**1147** год — упершыню згадана слова «Масква». Князь Юрый Далгарукі запрасіў чарнігаўскага князя Святаслава Ольгавіча на сустрэчу: *«Приди ко мне, брате, в Москов»*. Дзякуючы летапіснай згадцы пра сустрэчу «ў Маскове», князь увайшоў у гісторыю як заснавальнік Масквы. Хоць горад, відавочна, існаваў задоўга да гэтага.

**1892** год — нарадзіўся Багдан Жыранік, польскі паэт, перакладчык беларускай літаратуры. У 1919—1920 гадах збіраў этнаграфічныя матэрыялы на Палессі. Склаў (пераважна з уласных перакладаў) анталогію беларускай паэзіі. Аўтар кнігі «Нарыс беларускай літаратуры», у якой разглядаў шляхі развіцця беларускага пісьменства ад Францыска Скарыны да Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Папулярызатар беларускай літаратуры ў Польшчы. Памёр у 1984 годзе.

**1927** год — 90 гадоў таму на 8-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў прынята 2-я Канстытуцыя Беларускай ССР (дзейнічала да 1937 года). Дакумент складаўся з 13 раздзелаў і 76 артыкулаў. БССР абвяшчалася сацыялістычнай дзяржавай дыктатуры пралетарыяту, у якой уся ўлада належала Саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Былі замацаваны і міжнародныя адносіны, звязаныя са стварэннем СССР і ўваходжаннем БССР у саюзную дзяржаву; заканадаўча замацоўваліся асноўныя прынцыпы федэратыўнай дзяржавы і суверэнітэту БССР. Зямля, лясы, нетры, вада, фабрыкі і заводы, транспарт, сродкі сувязі абвяшчаліся ўласнасцю дзяржавы. Выбарчае права атрымлівалі грамадзяне, якія дасягнулі 18 гадоў. Вышэйшай уладай у БССР зацвярджаўся Усебеларускі з'езд Саветаў, а ў перапынках паміж з'ездамі — Цэнтральны выканаўчы камітэт (ЦВК) БССР.

**1945** год — адбылося ўзброенае паўстанне вязняў канцлагера Бухенвальд. У гэты момант у лагеры знаходзіліся некалькі дзясяткаў тысяч зняволеных з 18 краін Еўропы. Удзельнікі паўстання адбілі і ўтрымлівалі за сабой лагерныя плошчы. Яны пачалі перадаваць у радыёэфір сігнал «SOS». Праз некалькі дзён амерыканскія войскі дабраліся да лагера. Перш за ўсё амерыканцы выдалі ўказ аб здачы паўстанцамі зброі. Батальён савецкіх ваеннапалонных гэта рабіць адмовіўся і працягнуў сваё існаванне як самастойная вайсковая адзінка. У выніку гэтага паўстання былі вызвалены вязні фашысцкіх канцлагераў Бухенвальд і Дора, 22 красавіка вызвалены вязні Заксенхаўзена, 29 красавіка — Дахау, а 30 красавіка — Равенсбрука. А ў памяць пра гэтае паўстанне была заснаваная памятная дата — Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў.



Было сказана

**Анатоль ФРАНС,**
**французскі пісьменнік і літаратурны крытык:**
*«Мы не ведаем, што рабіць з нашым кароценькім жыццём, але ўсё-такі хочам жыць вечна».*

УСМІХНЕМСЯ

У аднаго вучонага была вялікая бібліятэка. Аднойчы яго спыталі:

— Паважаны акадэмік! А на якое самае галоўнае пытанне вы шукаеце адказ ва ўсіх гэтых кнігах?

— Дзе мая заначка?!

**Калі нос свярбіць, а выпіць няма на што, падае ўсякі давер да народных прыкмет.**

Жанчына тэлефануе ў шлюбную кантору і тлумачыць, якога мужа ёй хацелася б мець:

— Ён павінен быць ветлівым, мець рознабаковыя інтарэсы, любіць жывёл, расказваць мне розныя цікавыя гісторыі, паведамляць пра падзеі ў свеце і ніколі мяне не перабіваць.

— Навошта вам муж? Купіце тэлевізар!

**Брытанскія навукоўцы расказалі пра тое, як яны з'явіліся на Зямлі.**




Малюнак Юрыя МІХАЙЛАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1438.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 красавіка 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12